VII Дыяцэзіяльны дзень дзіцяці адбудзецца ў Гродне

Аўтар: Рэдакцыя
07.05.2017 00:00



Мерапрыемства пройдзе 1 чэрвеня ў парафіі Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі (Паўднёвы). На сустрэчу запрашаюцца малодшыя вернікі, каб разам у малітве і забаве добра правесці час. Дэвіз сёлетняга мерапрыемства – “Марыя, наша Маці, аб’явілася дзіцяці”.

Умовы ўдзелу:

• узрост удзельнікаў – да 14-ці гадоў;
• 1 апякун на 10 дзяцей;
• з сабой мець кубак і коўдру або дыванок.

Колькасць удзельнікаў не абмежаваная (запрашаюцца дзеці з Гродзенскай дыяцэзіі і іншых дыяцэзій Беларусі). †

Арганізатары заклікаюць уключацца ў праграму сустрэчы. Тым, хто хацеў бы прадставіць тэатральную сцэнку, заспяваць на сцэне або прапанаваць іншыя ідэі, якія маглі б узбагаціць план мерапрыемства, патрэбна папярэдне скантактавацца з арганізатарамі.

Аб удзеле неабходна паведаміць да 26 мая адказнаму за Дыяцэзіяльны дзень дзіцяці **кс. Юрыю Марціновічу па тэл. (8 044) 460-61-40, (8 029) 784-05-72 або на e-mail: sakralna@op.pl.**